# Нацыянальная спадчына беларусаў

Фальклорна-музычная кампазіцыя

## Ход мерапрыемства

*Гучаць фанфары, на сэну выходзяць вядучыя, апранутыя ў нацыянальныя касцюмы.*

**Вядучы.** Добры дзень, шаноўныя госці – настаўнікі, бацькі і аднакласнікі!
**Вядучая**. Добры дзень! Мы шчыра вітаем вас у нашай зале і запрашаем на фальклорна-музычную кампазіцыю “Нацыянальная спадчына беларусаў”.

*Гучыць песня “Беларускі край”. Выходзяць вучні VI А класа.*

**Вучань 1.** Наш родны беларускі край! Ён багаты і непаўторны, прыгожы і мудры.
**Вучань 2.** Кожны горад і кожная вёска, кожны двор і кожны чалавек – скарбонка гісторыі і мудрасці.
**Вучань 3.** А як вы думаеце, што галоўнае ў жыцці чалавека? Што аснова ўсяму? Усяму галава?
**Вучань 4**. Зразумела і бясспрэчна, што гэта хлеб. Не ўсе ведаюць, як на нашым стале з’яўляецца акраец хлеба.
**Вучань 1.** Сёння ёсць шмат гатункаў хлеба, яго выпякаюць на заводах. Для гэтага існуюць спецыяльныя машыны і электрычныя печы.
**Вучань 2.** Даўней хлеб выпякалі гаспадыні самі, замешвалі цеста, пяклі яго ў печы і частаваліся. Уменне пячы хлеб лічылася прыкметай гатоўнасці дзяўчыны да сямейнага жыцця.
**Вучань 3.** Выпечка хлеба, як і гатаванне ўвогуле, лічылася жаночай справай. Мужчыны ўмелі гатаваць, але займаліся гэтым толькі тады, калі гэта не магла зрабіць жанчына (хварэла, была ў ад’ездзе).
**Вучань 4.** У мінулыя часы сем’і былі вялікія, разам маглі жыць тры, а то і чатыры пакаленні, некалькі братоў з жонкамі і дзецьмі. Хлеб пякла галоўная гаспадыня, спачатку свякроў, потым старэйшая нявестка.
**Вучань 1.** Пяклі хлеб раз на тыдзень, працэс расцягваўся амаль на суткі: пасля абеду рашчынялі цеста, яно квасілася 10–12 гадзін, назаўтра раніцай цеста вымешвалі, пакідалі, каб падышло, а пад абед фармавалі боханы.
**Вучань 2.** Толькі на пачатку XX стагоддзя увайшлі ва ўжытак дрожджы, і то пераважна для белага хлеба. Даўней 10–12 гадзін патрабавалася, каб рошчына ўкісла, цеста “спрацавала” само ці з дапамогай квасу, цёртай бульбы.
**Вучань 3.** Пакуль цеста падыходзіла, у хаце забаранялася сварыцца, а дзецям – крычаць і бегаць. У гэтых забарон ёсць рацыянальны аспект (ад вібрацый цеста можа асесці), але ёсць і міфалагічны – праява пашаны да хлеба.

**Вучань 4.** Да таго круглыя ці авальныя боханы фармавалі мокрымі рукамі на хлебнай лапаце, на якую сцялілі лісце клёну, дубу, капусты, хрэну, аеру. “Садзілі” цеста на под печы, рэзка выцягваючы да сябе лапату.

**Вучань 1.** У гэты момант гаспадыня зганяла з печы ўсіх, хто там сядзеў.

**Вучань 2.** З адной дзяжы, у залежнасці ад яе памеру, выходзіла 5–8 боханаў, якія сям’я ела цэлы тыдзень.

**Вучань 3.** Ад хлеба да хлеба дзяжа стаяла ў самым пачэсным месцы ў хаце – на покуці. На яе сценках заставалася трохі цеста для закваскі на наступную выпечку. Дзяжу цалкам вымывалі толькі раз на год, на Вялікдзень.

**Вучань 4.** Перад тым як хлеб дастаць з печы, стол накрывалі чыстым ручнiком ці абрусам. Кожны бохан абмывалі вадой, клалі на стол і накрывалі ручніком.

**Хлеб**
**Таццяна Дзям’янава**

Ці гэта звычка, ці патрэба –
Адчуўшы лепшы ў свеце пах,
Я зноў цалую бохан хлеба,
Які трымаю ў руках.
Вось гэта водар! Ну й духмяны!
Смачней за ўсё, што з ім ядуць!
Але ж і варты той пашаны,
З якой на стол яго кладуць!
У ім болей кошту, чым каштуе.
Ды я без хлеба не магу –
Нібы ласунак ем – смакую
І, нібы скарб свой, берагу.
У ім – веліч сіл зямлі і неба:
Тут і сяўба, і ўсходаў рост,
І блаславленне шчодрай глебы,
Якой не шкодзіць і мароз.
І шум дажджоў, і сонцапёкі,
І каласоў налітых звон…
О, хлебаробы! Хлебапёкі!
За вашу працу – вам паклон!
За мазалі, за кроплі поту,
За працу – зранку да начы…
І я ізноў цалую ўпотай
Скарынку, цёплую з пячы…
А як за стол сядаю есці,
Хоць і прысмакі ёсць калі,
Імкнуся “дзякуй” небу ўзнесці
За хлеб, што маю на зямлі…

*Гучыць песня “Гляне сонца”.*

**Вядучы.** Зараз размова пойдзе пра зіму, зімовыя народныя святы, звычаі, абрады і традыцыі нашых продкаў.

**Вядучая.** Зіма, як вядома, – самая халодная пара года. Ідзе снег, бываюць сцюжы і завеі.

**Вядучы.** Нездарма беларуская прыказка гаворыць…

**Вядучая. …**калі не будзе зімой бела, то не будзе ўлетку зелена.

*Выходзяць вучні VI В класа.*

**Вучань 1.** Снежань – першы зімовы месяц, і называюць яго так таму, што ён снежны.

**Вучань 2**.Снежань, снежань, які чараўнік!Да акна цёмнай ноччу прынік. І малюе на шкле дзіўны сад,Нібы лета вяртае назад.

**Вучань 1.** У гэтым месяцы і пачынаюцца зімовыя святы. Адгорнем першую старонку нашай панарамы “Калядныя святы”.

**Вучань 2.** Каляды самыя доўгачаканыя і цікавыя, бо ўжо скончылася Піліпаўка (пост) і пачынаюцца святы.

**Вучань 1.** Назва свята – Каляды – мае язычніцкія карані. Лічыцца, што яна ўтварылася ад слова «кола», што азначае «сонца».

**Вучань 2.** Зараз каталікі святкуюць Каляды 25 снежня, а праваслаўныя вернікі адзначаюць свята 7 студзеня.

**Вучань 1.** Сустракаць Каляды належала чыстымі і фізічна, і духоўна. Таму перад святам заўсёды старанна прыбіралі ў хаце, шылі новую вопратку ці апраналі ўсё самае лепшае, мыліся ў лазні.

**Вучань 2.** Асаблівае месца ў святкаванні каляд адводзілася абрадаваму сталу і святочным стравам. Стол, вядома, павінен быць багатым, каб у наступным годзе мець добры ўраджай і здароўе .

**Вучань 1.** Першы дзень Каляд лічыўся выключна сямейным святам. Народ верыў: калі мы ўсе будзем разам за святым сталом, будзем жыць разам і круглы год.

**Вучань 2.** Калядаванне пачыналася на другі дзень. Хлопцы і дзяўчаты аб’ядноўваліся ў групы па 5−15 чалавек, пераапраналіся ў розныя касцюмы. Была каза, конь, бусел, мядзведзь. Усе апраналі вывернутыя кажухі, “цыганы” мазалі твар сажай, павязвалі каляровыя хусткі.

**Вучань 1.** Калядоўшчыкі збіраліся з надыходам цемры і з песнямі абыходзілі па чарзе ўсе хаты. Яны заходзілі ў двор і пачыналі спяваць віншавальныя, хвалебныя песні гаспадару, гаспадыні і іх дзецям, жадаючы ўсяго найлепшага.

**Вучань 2.** Калядныя дні лічыліся магічнымі, таму варажба была іх абавязковым атрыбутам. Варажылі ў асноўным дзяўчыны, каб даведацца, калі пойдуць замуж і як будзе выглядаць іх жаніх.

**Вучань 1**. Весела даўней святкаваліся Каляды. Добра, што і сёння людзі не забываюць спадчыны, пакінутай дзядамі і прадзедамі.

**Вучань 2.** А зараз мы разам з вамі развучым невялікія калядныя прыпеўкі.

**Вучань 1.** Хто вывучыць і лепш праспявае, той атрымае падарунак.

Прыйшла Каляда, Дзверы адчыняйце! Калядоўшчыкаў у хату

Шчыра запрашайце!
Прыйшлі мы да вас
З Козачкай рагатай,
Хай будзе ўвесь час

Ураджай багаты!

Жывіце заўжды
Ў ладзе дый раскошы,

А нам, маладым,
Не шкадуйце грошы!

**Вядучы.** Наступная старонка нашай панарамы – “Вадохрышча”.

**Вядучая**. Сёння такі снег! А снег на Вадохрышча – добра будуць раіцца пчолы і бульбы вырасце многа.

**Вядучы.** Святое Вадохрышча ваду пасвянчае, людзей падкрапляе.

**Вядучая**. На гэта свята людзі ідуць у царкву, свенцяць ваду. Прыйшоўшы дадому, акрапліваюць куты хаты, хлява і самі п’юць свянцоную ваду. Гэта прыбаўляе сілы, здароўя, веры ў лепшую долю.

**Вядучы.** Ваду трымаюць у хаце, бо яна служыць лекамі ад розных хвароб як людзям, так і жывёле.

**Вядучая**. Завяршае зіму месяц люты, апошні развітальны месяц зімы.

**Вядучы.** У народзе кажуць: “Прыйдзе люты – спытае, як ты абуты”, “Як у лютым адгукнецца, так у жніўні адзавецца”.

**Вядучая**. І гэта сапраўды так. Гаспадары пачынаюць рыхтавацца да веснавых работ.

**Вядучы.** Самае галоўнае свята лютага – Масленіца.

**Вядучая.**Масленіца – гэта “развітанне” з зімой, якое, на думку нашых продкаў, паскарала надыход вясны. Кожны з сямі дзён масленачнага тыдня меў сваю адметнасць.

**Вядучы.** У панядзелак, які атрымаў назву “сустрэча”, ішлі ў госці адзін да аднаго сваты. Таксама ў гэты дзень, на пачатку тыдня, рабілі пудзіла. Вялікую “пані” з саломы апраналі ў старое адзенне і каталі яе з вясёлымі песнямі на санях па ўсёй вёсцы.

**Вядучая**. У аўторак быў “зайгрыш” – агледзіны нявест.

**Вядучы.**“Лакамкай” называлі сераду, у гэты дзень зяць заглядваў на бліны да цешчы.

**Вядучая**. У чацвер – “разгул” – свята з гульнямі, танцамі, вогнішчам.

У гэты дзень, каб дапамагчы сонцу “прагнаць” зіму, нашы продкі каталіся на коніках “па сонейку” – па гадзіннікавай стрэлцы – вакол вёскі. Па вуліцах гарадоў і вёсак навыперадкі нясліся каляровыя запрэжкі. Звінелі званочкі, заліваліся гармонікі ...

**Вядучы.** Цешча ішла на бліны да зяця ў пятніцу, быў гэта “цешчын вечар”. Непавага зяця да гэтай падзеі лічылася сорамам і крыўдай і была падставай да вечнай варожасці паміж ім і цешчай, таму рыхтаваліся да прыхода госця старанна.

**Вядучая**. На наступны дзень, у суботу, адзначалі “залоўчыны вячоркі” – маладыя нявесткі запрашалі ў госці родных мужа.

**Вядучы.** У апошні дзень тыдня – “даравальную нядзелю” – прасілі адзін у аднаго прабачэння, а ў адказ чулі: “Бог даруе, і я дарую”.

**Вядучая**. Галоўнай ежай на святочным тыдні былі, безумоўна, бліны. А да іх смачны дадатак: смятанка альбо мёд. Круглыя, румяныя блінцы нагадвалі сонца. Таму лічылася, што іх ўжыванне паспрыяе надыходу вясны.

**Вядучы.** У гэтыя дзянькі ніхто не сядзеў у хаце. Дзеці і моладзь бавілі час на горках, каталіся на коніках. Вадзілі карагоды. Ды не простыя, а вакол масленічнага сімвалу – кола з рознакаляровымі стужкамі. Старэйшыя людзі хадзілі адзін да аднаго ў госці, віншавалі моладзь, што ажанілася ў гэтым годзе, зычылі ім дастатку і дабрабыту.

**Вядучая**. Вось і закрылася апошняя старонка нашай панарамы зімовых свят.

**Вядучы.** Усім вам жадаем моцнага здароўя, многа радасці і паболей светлых дзён!

*Вучні выконваюць народны танец.*

**Вядучы.** Ты ведаеш, як упрыгожвалі нашы продкі свае хаты?

**Вядучая.** Магчыма, што ручнікамі, бо ў маёй бабулі шмат ручнікоў у хаце.

**Вядучы.** А што яны абазначаюць?

**Вядучая**. Зараз мы і даведаемся.

*Выходзяць вучні VI Б класа.*

**Вучань 1.** Ручнік − рэч глыбока сімвалічная, шматзначная. Створаны па законах мастацтва, ручнік адлюстроўвае гісторыю народа, яго дух, творчыя памкненні і мастацкае светаўспрыманне. Гэта найкаштоўнейшы здабытак беларускай культуры і мастацтва.

**Вучань 2.** Ва ўзорах тканых і вышываных вырабаў зашыфравана гісторыя жыцця людзей і прыроды, гісторыя роднага краю. Ёсць такая легенда. Напрыканцы XII ст. на землі Беларусі абрушылася крыжацкая навала. Крыжакоў на адкрытых прасторах перамагчы было вельмі цяжка, практычна немагчыма. Але нашы продкі, як партызаны, хаваліся ў лесе. Яны слалі ручнікі ў выглядзе сцежкі на балоцістай глебе і заманьвалі туды ворагаў. А ў крыжакоў былі на ботах шпоры, і калі яны праходзілі па гэтых ручніках, то чапляліся шпорамі за іх і падалі. З засады выскаквалі воіны і з лёгкасцю бралі ворагаў у палон.

**Вучань 1.** Як выглядаў старажытны беларускі ручнік? Ён быў трошкі меншы па сваіх памерах за сучасны, вырабляўся нескладанымі спосабамі ткацтва, а калі арнаментаваўся, то пераважна шыццём. У колеравых адносінах пераважалі шэра-белыя ці прыглушаныя чырвона-карычневыя адценні льнянога прадзіва.

**Вучань 2.** У залежнасці ад прызначэння і функцыі ручнікі маюць розныя назвы. Ручнікі ўтылітарныя паўсюдна на Беларусі называюцца ўціральнік, уцірач, уцірка − кавалак тканіны без дэкору ці з вузенькімі палоскамі-ператыкамі па краях. Яго выкарыстоўвалі для побытавых патрэб (у паўсядзённым жыцці выцiралі рукі і твар). Прычым на патрэбу сям'і выдзяляўся толькі адзін ручнік, які звычайна вісеў пасярэдзіне сцяны. У лазню яго не бралі.

**Вучань 1.** Да ліку ручнікоў утылітарнага прызначэння належаў скарач, ці трапкач, пацірач (на Палессі), ці брэндзал (на паўночным захадзе) – маленькі, квадратнай ці падоўжанай формы, неад'емнай прыналежнасцю якога былі доўгія махры. Яны

ўжываліся для выцірання посуду, рук. Галоўная ж функцыя такога ручніка – зручная, лёгкая і танная прылада для пераносу керамічнага посуду з ежай.

**Вучань 2.** Самым высокім статусам надзяляліся абрадавыя, або рытуальныя, ручнікі, багата аздобленыя натыканнем, вышыўкай. Абрадавыя ручнікі выкарыстоўвалі ў святы і ў абрадах. Яны былі ўпрыгожаны арнаментальнай вышыўкай з кветак, геаметрычных сімвалаў (круг, крыж, ромб) і чароўных птушак. У якасці фарбаў выкарыстоўвалі расліны. Чорны колер атрымлівалі пры дапамозе бабоўніку ці змешвалі сок буракоў з настоем кары вольхі. Чырвоны рабілі з настою валошкі, адвару сырой мацярдушкі, кары рабіны. Для зялёнага колеру выкарыстоўвалі лісты бярозы, адвар з сырых лістоў каманімніка.

**Вучань 1.** Яшчэ адным відам ручнікоў была намітка – своеасаблівы галаўны ўбор беларускіх жанчын. Канцы ручніка намотвалі, завівалі, мудрагеліста абкручвалі вакол галавы, пакідаючы свабодным толькі твар. У беларусаў намітка лічыцца адным з самых архаічных прадметаў жаночага строю.

**Вучань 2.** Ручніковая тканіна, прызначаная для ўпрыгожвання абразоў і бажніц, называлася набожнік. Пакрывалі бажніцу звычайна адным суцэльным вырабам, іншы раз вылучаючы галоўны абраз асобным, найлепш аздобленым набожнікам.

**Вучань 1.** Выраблялі спецыяльныя аброчныя ручнікі, якія ахвяравалі ў царкву ці касцёл, капліцу ў крызісныя сітуацыі (засуха, эпідэмія, вайна, хваробы дзяцей). На Палессі многія жанчыны ткалі спецыяльныя ручнікі-абярэгі для ўсёй сям'і і выкарыстоўвалі іх для палягчэння родаў, пазбаўлення ад бясплоддзя, а таксама для захавання хатняй жывёлы і паляпшэння дабрабыту. Гэтыя ручнікі трымалі за абразамі, але пры неабходнасці бралі з сабой у далёкую дарогу. Ручнікі-абярэгі пераходзілі з роду ў род, з пакалення ў пакаленне. У многіх сем'ях яны жывуць і па сённяшні дзень.

*На фоне прыгожага беларускага пейзажу гучыць ціхая інструментальная музыка. Вучаніца чытае верш.*

**Наш беларускі ручнік**
**А. Дзеружынскі**

З каласоў жытнёвых ён сатканы,
Наш ручнік, наш беларускі ўзор.
Васільком, пралескай вышываны,
Хвалямі блакітнымі азёр.
Наш ручнік, як золата, свіціцца,
Кветкамі вясновымі цвіце
І ў прасторных хатах, у святліцах
На вяселлі радуе гасцей.
Быццам веюць ветрыкам дубровы
І прыемнай свежасцю сады,
І пад лёгкі шолах ручніковы
Песні, пацалункі маладых.
Зіхаціць ручнік наш саматканы,
Родны беларускі наш узор,
І глядзіш, глядзіш зачараваны –
На дзівосны, казачны ўбор.

**Вучань 2**. Чаму нашу Радзіму называюць Белай Руссю? Існуе некалькі тлумачэнняў. Адны лічаць, што наша зямля атрымала такую назву, бо не была заваяваная іншаземцамі (белая – значыць чыстая, вольная, незалежная). Другія мяркуюць, што белае льняное адзенне, светлыя валасы нашых продкаў паслужылі для яе назвы. А можа, так зямля стала называцца ад разасланых па берагах рэчак і азёраў ручнікоў, якія ад сонца і вады станавіліся бялюткімі-бялюткімі? Ад тых палатняных белых ручнікоў-крылаў, што ў кожнай нашай хаце…

*Гучыць песня “Беларусачка”.*

**Вядучы.** Добра мы сёння адпачываем. А як раней адпачывалі дарослыя і дзеці?
**Вядучая**. Кажуць, што інтэрнэту тады не было.
**Вядучы**. Так, не было. Адпачывалі, разгадваючы загадкі, расказваючы казкі.
**Вядучая**. Гэта, напэўна, вельмі цікава. Давайце і мы паспрабуем разгадаць загадкі.
*Выходзяць вучні VI Г класа*
**Вучань 1**. Можа, не ўсе ведаюць, што такое загадкі і для чаго яны патрэбны людзям?
**Вучань 2**. Давай спачатку раскажам, а пасля паразгадваем.
**Вучань 1**. Людзі пачалі ствараць загадкі ў глыбокай старажытнасці, калі навакольны свет для іх быў надзелены магічнай сілай. Загадкамі апісвалі незразумелыя прадметы ці з’явы. Чалавек з дапамогай загадак таксама хаваў свае думкі і намеры, каб зберагчы ад нячыстай сілы сваю сям’ю, жытло, жывёлу, прылады працы.
**Вучань 2.**Складзеныя такім чынам загадкі прапаноўваліся для разгадвання. Так людзі правяралі кемлівасць. Маленькіх дзяцей з дапамогай загадак вучылі і забаўлялі. Цяпер ні адно дзіцячае свята не абыходзіцца без загадак. Яны сталі любімай забавай. Давайце і мы паразгадваем загадкі.
Глянь праз акно – відаць сіняе палатно. (Неба.)
Без ног бяжыць, без вачэй глядзіць. (Вада.)
Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць. (Гром.)
Рук і ног не мае, а дзверы адчыняе. (Вецер.)
Адзін лье, другі п’е, трэці расце. (Дождж, зямля, трава.)
Без рук малюе, без зубоў кусае. (Мароз.)
На двары гарою, а ў хаце вадою. (Снег.)
Летам апранаецца, зімой распранаецца. (Дрэва.)
Хоць у капелюшы, а галавы не мае. (Грыб.)
Хто нас поіць, корміць, а есці не просіць? (Зямля.)

*Гучыць песня “Мая Беларусь”.*
**Вядучы.** Мы тут святы ўзгадалі, усе загадкі разгадалі.
**Вядучая.** Мы прыгожа размаўлялі –танцавалі, і спявалі!
**Вядучы.** Развітацца час прыйшоў.
**Вядучая.** І пайсці ўсім дамоў!
**Вядучыя разам.** Да пабачэння! Дзякуй за ўвагу!